**Пілігрымы напагатове**

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
10.06.2018 00:00




Разам са спякотным летам прыходзіць гарачая пара пілігрымак. Як і ў мінулыя гады, у чэрвені выходзяць пешыя паломніцтвы ў нацыянальны санктуарый у Будславе, а ў ліпені вернікі скіроўваюцца ў дыяцэзіяльны санктуарый у Тракелях. Да якой пілігрымкі з Гродзенскай дыяцэзіі можна далучыцца, каб разам прайсці шлях да святога месца? І якога зводу правіл варта прытрымлівацца паломніку, каб духоўнае падарожжа прынесла багаты плён і пакінула ў душы глыбокі след? †



Пешыя пілігрымкі ў Будслаў

**IV пешая пілігрымка Ліда – Будслаў**

Паломніцтва вырушыць 23 чэрвеня пасля св. Імшы ў касцёле Узвышэння Святога Крыжа ў 9.00
Запіс і падрабязная інфармацыя па тэлефоне: (8 029) 121-10-82, кс. Дзяніс Бразінскі.

**XIX пешая пілігрымка Смаргонь – Будслаў**

Салезіянская моладзевая евангелізацыйная пілігрымка вырушыць 26 чэрвеня пасля св. Імшы ў
Паломніцтва пройдзе пад дэвізам “Пане, дай мне гэтай вады!”.
Запіс і падрабязная інфармацыя па тэлефоне: (8 029) 389-76-69, кс. Павел Шчарбіцкі SDB.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
10.06.2018 00:00

**VIII пешая пілігрымка Гудагай – Будслаў**

Паломнікі вырушаць 25 чэрвеня пасля св. Імшы ў касцёле Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Ма
Запіс і падрабязная інфармацыя па тэлефоне: (8 029) 656-19-25, а. Казімір Мараўскі OCD.

***Урачыстасці ў нацыянальным санктуарыі Маці Божай у Будславе будуць праходзіц***



Пешыя пілігрымкі ў Тракелі

**Гродна – Тракелі**

Пачатак пілігрымкі: 2 ліпеня ў 9.00 (св. Імша ў касцёле св. Францішка Ксаверыя).
Адказны: кс. Павел Салабуда, (8-029) 637-07-17.

**Навагрудак – Тракелі**

Пачатак пілігрымкі: 4 ліпеня ў 9.00 (св. Імша ў касцёле св. Міхала Арханёла).
Адказны: кс. Юрый Жэгарын, (8-044) 552-21-99.

**Іўе – Тракелі**

Пачатак пілігрымкі: 2 ліпеня ў 9.00 (св. Імша ў касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў Сурвілішках).
Адказны: кс. Ян Гавэцкі, (8-029) 632-21-79.

**Ашмяны – Тракелі**

Пачатак пілігрымкі: 3 ліпеня ў 7.30 (св. Імша ў касцёле свсв. апосталаў Пятра і Паўла ў Баруна×
Адказны: кс. Ян Варанецкі, (8 029) 880-92-94.

**Ваўкавыск – Тракелі**

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
10.06.2018 00:00

Пачатак пілігрымкі: 2 ліпеня ў 8.00 (св. Імша ў касцёле св. Вацлава).
Адказны: кс. Юрый Садоўскі, (8-033) 344-40-20.

 ***Урачыстасці ў дыяцэзіяльным санктуарыі Маці Божай Каралевы Нашых Сем'яў у***

10 запаведзяў пілігрыма

**1. Загадзя паклапаціся пра дарогу.**
Пілігрым павінен напярэдадні падумаць аб тым, што можа спатрэбіцца яму ў дарозе, і сабраць неабходныя рэчы. Гэта не адбываецца ў апошні дзень – ёсць верагоднасць нешта выпусціць з-пад увагі. Пра шмат якія рэчы ўжо паклапаціліся арганізатары. Няхай жа асабіста Табе не будзе сорамна за такія дэталі, як, напрыклад, непадрыхтаваны заплечнік або нязручны, некамфортны абутак.

**2. Вызначыся з інтэнцыяй, з якой вырушыш у шлях.**
Задумайся, што Цябе зараз хвалюе, непакоіць, з якім намерам хацеў бы адправіцца ў дарогу да святога месца. Гэта могуць быць інтэнцыі падзякі, просьбы, перапрашэння за грахі і інш. Не забывайся таксама "забіраць" інтэнцыі ў гаспадароў дома, дзе Цябе прымаюць на начлег. Гэта будзе найлепшай падзякай людзям за ўчыненае дабро.

**3. Памятай, што найважнейшы ў дарозе – Бог.**
Пілігрымка – гэта, перш за ўсё, час малітвы і пакаяння (рэкалекцыі ў дарозе). На галоўным месцы павінен быць Бог, дзеля Яго скіроўваемся ў шлях да святога месца. Бог не чакае "на фінішы" – Ён з Табою ў дарозе. Таму варта першачаргова засяродзіць увагу не на тым, што "з гэтага свету", але скіраваць свой позірк на Найвышэйшага, разам з якім шлях пілігрыма напаўняецца глыбокім і сапраўдным сэнсам.

 **4. З годнасцю і самаахвярнасцю прымай напатканыя цяжкасці.**
Шлях пілігрыма нялёгкі. Нярэдка ў дарозе здараюцца розныя перашкоды, нечаканасці. Варта прымаць жыццёвыя складанасці ў духу пілігрымскай самаахвярнасці. У той жа час можна ахвяраваць цярпенні ў пэўнай інтэнцыі. Такім чынам, гэта прынясе максімальную карысць у духоўным плане.

**5. Будзь пунктуальным**.
Спазненні з прывала, на пасілак, св. Імшу парушаюць парадак пілігрымкі і ствараюць непаразуменні паміж яе ўдзельнікамі. Безумоўна, трэба паважаць людзей, з якімі крочыш побач. Нядбайныя адносіны могуць даставіць акружаючым непрыемнасці, праблемы, якіх можна было б і пазбегнуць.
Неабходна быць пільным, захоўваючы правілы распарадку, падпарадкоўвацца адказным за паломніцтва, якія кіруюцца вызначанай праграмай.

**6. Будзь уважлівым да таварышаў па пілігрымцы.**
Мець адкрытае на бліжняга сэрца – значыцца быць чулым да яго патрэб. Калі заўважаеш, што некаму патрэбна дапамога, не заставайся абыякавым. І заўсёды старайся знайсці для таварышаў па пілігрымцы добрае слова і ўсмешку. Такія жэсты з

Твайго боку здольны ўзняць бліжняга на духу і дадаць яму патрэбных сіл, калі іх ужо не стае.

**7. Вызнавай сваю веру з гонарам.**

Не саромейся сведчыць аб сваёй прыналежнасці да Хрыстовага Касцёла. Далучайся да спеваў праслаўлення, супольнай малітвы, з якімі па дарогах крочыць пілігрымка. Не лянуйся памахаць рукой жыхарам населеных пунктаў, праз якія або каля якіх праходзіць паломніцтва. Пілігрымка з'яўляецца выразнай дэманстрацыяй хрысціянскай веры.

**8. Падчас малітвы ўзгадвай пра іншых людзей.**

У дарозе падчас агульнай або прыватнай малітвы і св. Імшы ўспомні пра родных, блізкіх, сяброў, знаёмых і незнаёмых, з якімі разам ствараем супольнасць Касцёла. Прысвяці сваю малітву ў іх інтэнцыях. Заступніцкая, яна мае асаблівую моц.

**9. Прыступі да сакраманту пакаяння, каб злучыцца з Хрыстом у Эўхарыстыі.**

Каб плённа скарыстасць з рэкалекцый у дарозе, варта прыступіць да сакраманту пакаяння і паяднання. Гэта можна зрабіць непасрэдна перад пачаткам пілігрымкі або падчас яе. Сэрца, ачышчанае ад грахоў, дорыць адчуванне прыемнай бязважкасці, з-за чаго і шлях падаецца лягчэйшым.

**10. Па прыбыцці да святога месца прымі ўдзел у чуванні.**

Прыйшоўшы ў канчатковы пункт пілігрымкі, знайдзі час, каб пабыць самнасам з Богам. Безумоўна, вельмі важна прыняць удзел ва ўрачыстасцях, але патрэбны і нейкі час, каб суцішыцца. Менавіта для гэтай мэты кожны скіроўваецца да святога месца, каб асабіста стаць перад Богам.